Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар БДУКМ
_____ Н.У.Карчэўская
25 чэрвеня 2026 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6/86-148 эвуч.

ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

СКЛАДАЛЬНІК:

Д.В.Герасімёнак, загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Я.Л.Краснова, вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", кандыдат культуралогіі;

Т.С.Жылінская, загадчык кафедры інфармацыйных тэхналогій у культуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 9 ад 18.04.2026);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № № 6 ад 24.06.2026)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль "Лічбавая культура" складаецца з вучэбных дысцыплін "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці", "Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю". Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці".

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці" абумоўлена тым, што сучасныя асаблівасці рэалізацыі турысцкага прадукту не дазваляюць казаць аб паўнавартасным развіцці турыстычнага прадпрыемства без адпаведнага інфармацыйнага забеспячэння. Менавіта інфармацыйныя тэхналогіі забяспечваюць сувязі паміж вытворцамі турыстычных паслуг не толькі ў выглядзе патокаў інфармацыйных дадзеных, але і ў форме паслуг і плацяжоў. У сувязі з гэтым вывучэнне прынцыпаў і метадаў прымянення сучасных інфармацыйных тэхналогій у індустрыі турызму з'яўляецца неабходнай умовай падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтай галіне.

Асноўная *мэта* вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці": фарміраванне ў студэнтаў тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў прымянення інфармацыйных тэхналогій у сферы турыстычных паслуг.

Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці": азнаёміць будучых спецыялістаў з сучаснымі інфармацыйнымі і камунікацыйнымі тэхналогіямі ў турызме; навучыць студэнтаў рабоце з глабальнымі сістэмамі рэзервавання і браніравання, аўтаматызаванымі сістэмамі кіравання прадпрыемствам турыстычнай індустрыі.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны асноўнымі мэтамі прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў выступаюць фарміраванне і развіццё кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце, якія забяспечваюць рашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступнай кампетэнцыі ў адпаведнасці з вуэбным планам па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны: ствараць інавацыйныя культурныя праекты, укараняць і ацэньваць іх вынікі,

распрацоўваць і выкарыстоўваць інавацыйныя тэхналогіі ў музейнай і турыстычнай індустрыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці" студэнты павінны *ведаць*:

– ролю і месца інфармацыйных тэхналогій у музейнай і турыстычнай дзейнасці, іх уплыў на развіццё сучаснай індустрыі турызму;

– прызначэнне і прынцыпы працы прыкладных праграм музейнай і турыстычнай сферы пры рашэнні задач збору, сістэматызацыі, апрацоўкі і захоўвання інфармацыі;

– магчымасці віртуальных, мультымедыйных і інтэрактыўных тэхналогій у прадстаўленні музейных калекцый і турыстычных прадуктаў.

умець:

– выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі ў музейнай і турыстычнай дзейнасці пры стварэнні часовых і стацыянарных экспазіцый, распрацоўцы віртуальных праектаў, лічбавых тураў і інтэрактыўных прадуктаў;

– карыстацца асноўнымі магчымасцямі, паслугамі і інфармацыйнымі рэсурсамі камп'ютарных сетак, у тым ліку музейнымі і турыстычнымі інтэрнэт-парталамі.

Валодаць навыкамі:

– навыкамі інтэграцыі сучасных лічбавых тэхналогій у музейныя, турыстычныя і культурна-асветніцкія праекты;

– пошуку інфармацыі ў Інтэрнэт, эфектыўнага выкарыстання музейна-турыстычных рэсурсаў у вучэбнай, навуковай і прафесійнай дзейнасці.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці" распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі вучэбных дысцыплін "Гісторыя і арганізацыя турызму", "Менеджмент і маркетынг у турызме", "Тураперэйтынг", "Эканоміка турызму" і іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, якія служаць падмуркам у набыцці прафесійных ведаў па спецыяльнасці "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны".

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія мэтазгодна выкарыстоўваць пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны, адносяцца: гісторыка-тэматычны падыход; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; камунікатыўныя тэхналогіі; метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць разнастайныя варыянты самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. Для правядзення семінарскіх заняткаў варта выкарыстоўваць методыкі актыўнага навучання, метад малых груп, дыскусійныя формы.

У адпаведнасці з вучэбным планам, на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці" усяго прадугледжана 92 гадзіны, з іх 46 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 20 гадзін, семінарскія заняткі – 26 гадзін.

Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне, тэсціраванне. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці". Асноўны паняційна-тэрміналагічны апарат. Мэты выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у турызме.

Тэма 1. Агляд інфармацыйных тэхналогій у індустрыі турызму

Уплыў інфармацыйных тэхналогій на бізнес. Інфармацыйная бяспека. Роля, значэнне і перспектывы развіцця інфармацыйных тэхналогій у турызме. Класіфікацыя турысцкіх інфармацыйных рэсурсаў. Турыстычныя парталы, турыстычныя агенцтвы і іншыя сэрвісы і паслугі сеткі Інтэрнэт. Электронная камерцыя ў турызме.

Тэма 2. Праграмнае забеспячэнне дзейнасці турыстычнага прадпрыемства

Этапы аўтаматызацыі турфірмы. Фактары, якія ўплываюць на выбар турфірмай праграмнага прадукту. Выбар праграмнага прадукту. Класы сучасных аўтаматызаваных сістэм. Патрабаванні, што прад'яўляюцца да тыпавой інфармацыйнай тэхналогіі кіравання.

Агляд найбольш папулярных праграмных прадуктаў для аўтаматызацыі дзейнасці тураператара і турагенцтва. Праграмнае забеспячэнне "Мастер-Тур".

Тэма 3. Сістэмы рэзервавання і браніравання

Глабальныя і карпаратыўныя сеткі. Гісторыя іх узнікнення і развіцця. Глабальныя сеткі і іх магчымасці. Абсталяванне і праграмнае забеспячэнне глабальных сетак.

Класіфікацыя сістэм браніравання і рэзервавання. Характарыстыка і функцыянальныя магчымасці сістэм браніравання і рэзервавання. Агульная характарыстыка асноўных сістэм (Amadeus, Sabre, Worldspan, Galileo): функцыянальныя магчымасці і рэгіянальнае распаўсюджанне. Недалучальныя сістэмы браніравання (Fidelio, Trust, SRS і інш.).

Тэма 4. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у музеі

Асноўная мэта выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у музейнай дзейнасці. Інфарматызацыя сервісных і рэсурсных функцый музея. Інтэграванне інфармацыйных тэхналогій у экспазіцыйнай прасторы. Важнасць

вырашэння праблем музейнай камунікацыі. Пошук новых прыёмаў павышэння эфектыўнасці музейных экспазіцый.

Вопыт стварэння электронных экспазіцый. Электронны этыкетаж, інфакіёскі, плазменныя панэлі, тачскрыны ў музейнай экспазіцыі. Кіраванне апаратна-праграмным комплексам музейнай экспазіцыі.

Канцэпцыі выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у дзейнасці беларускіх музеяў. Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Тэма 5. Музейныя інтэрнэт-рэсурсы

Web-сайты міжнародных арганізацый. ЮНЕСКА, ІКОМ, ІКАМОС, ІККРОМ. Інфармацыйныя рэсурсы па музеязнаўству. Праекты "Музей Будущего", "МАРТ", партал "Российское музееведение". Музейныя інтэрнэт-рэсурсы краін-суседзяў. Партал "Музеи России".

Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Парталы "Музеі Беларусі", "Вяртанне". Праекты "Музеі Беларусі разам з БЕЛКАРТ", "Жывая спадчына Беларусі". Інтэрнэт-рэсурсы рэспубліканскіх ведамстваў і арганізацый: Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнае агенцтва па турызму, Нацыянальная бібліятэка Беларусі і інш.

Тэма 6. Віртуальныя музеі і экспазіцыі

Арганізацыя работ па стварэнні электроннай версіі музея. Размяшчэнне і рэгістрацыя музея ў сетцы Інтэрнэт. Магчымасці web-сайта музея. Рэкламная роля інтэрнэт-рэсурсаў у музейнай справе.

Асноўныя мадэлі віртуальных музеяў. Структура і магчымасці. Этапы стварэння віртуальнага музея. Тэхнічнае і праграмнае забеспячэнне, неабходнае для стварэння віртуальнага музея. Віртуальная экспазіцыя. Стандартызацыя інфармацыі аб музейных калекцыях.

Віртуальныя экспазіцыі беларускіх музеяў.

Тэма 7. Аўтаматызаваныя інфармацыйныя сістэмы музея

Падыходы да стварэння аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм (АІС). АІС для асобных музеяў рознага тыпу. Стварэнне агульнадзяржаўнай сістэмы ўліку музейных калекцый. Мэты і задачы АІС. Патрабаванні да сістэмы, яе функцыянальныя характарыстыкі. Тыпавыя праектныя рашэнні.

Камп'ютэрныя і тэхнічныя патрабаванні да функцыянавання АІС у музеі. Тэлекамунікатыўнае забеспячэнне. Камп'ютэрныя лакальныя сеткі. Арганізацыя работ па стварэнню і ўкараненню АІС у музеі.

Беларускі вопыт укаранення АІС у музеі. ТАА НПФ "ІНЕАК" і яго роля

ў інфармацыйным забеспячэнні дзейнасці беларускіх музеяў. Нацыянальная аўтаматызаваная ўлікова-фондавая сістэма “АМС-5” – “Музей-5”. Яе станоўчыя бакі і недахопы. Мэты і задачы, якія вырашае АІС.

Інструкцыя па карыстанні АІС “АМС-5”. Адладка асноўных палёў. Магчымасці АІС.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін		Колькасць гадзін КСР	Форма кантролю ведаў
		Лекцыі	Семінарскія заняткі		
	Уводзіны	0,5			
1.	Агляд інфармацыйных тэхналогій у індустрыі турызму	3,5	2		
2.	Праграмнае забеспячэнне дзейнасці турыстычнага прадпрыемства	2	4	2	Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, ПЗ “Мастер-Тур”
3.	Сістэмы рэзервавання і браніравання	2	2		
4.	Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у музеі	2	2		
5.	Музейныя інтэрнэт-рэсурсы	2	2		
6.	Віртуальныя музеі і экспазіцыі	2	2		
7.	Аўтаматызаваныя інфармацыйныя сістэмы музея	2	6	8	Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, АІС “АМС-5”
	Разам:	**16**	**20**	**10**	

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Літаратура

Асноўная

1. Абдель Вахед, Э. А. М. Современные технологии в индустрии туризма и гостиничном сервисе : учебник / Эссам Абдаллах Махмуд Абдель Вахед, В. А. Мендельсон, Л. Н. Абуталипова. – Казань : КНИТУ, 2021. – 204 с. : ил., табл. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=701229 (дата обращения: 15.05.2026).

2. Ноль, Л. Я. Информационные технологии в деятельности музея : учебное пособие / Л. Я. Ноль. – Москва : РГГУ, 2007. – 203 с.

Дадатковая

1. Информационная культура музеолога : учебник / Н. И. Гендина, Д. Д. Родионова, Е. В. Косолапова, Л. Н. Рябцева. – Кемерово : КемГИК, 2022. – 227 с. : табл. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=701064 (дата обращения: 15.05.2026).\

2. Метадычныя матэрыялы // Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. – URL: http://www.dkmf.by/documents/methodical (дата обращения: 15.05.2026).

3. Методические рекомендации по созданию и эксплуатации сайтов и порталов учреждений культуры музейного типа // Пушкинский музей. – URL: http://e-books.arts-museum.ru/site_method/ (дата обращения: 15.05.2026).

4. Себруковіч, В. Ю. Медыя ў інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы музея / В. Ю. Себруковіч // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2021. – № 1 (39). – С. 153–159.

Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці".

Для дыягностыкі атрыманых студэнтамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

- тэставыя заданні па асобных падраздзелах і вучэбнай дысцыпліне ў цэлым;
- пісьмовыя работы па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;
- мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;
- выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне заліку.

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці", вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўку да заліку.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

- фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
- засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
- развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення заліку.

Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя тэхналогіі ў турыстычнай дзейнасці" рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання студэнтаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы.

У лік эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю ў студэнтаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; кантэнт-аналізу; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.